ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

12 КАСТРЫЧНІКА 1995 года
чацвер

№14 (1731)



*Сутонне...*

<u>*Весткі з галоўнага корпуса*</u>

## Адкрываецца Цэнтр

Як нам паведамілі ў Упраўленні па міжнародных сувязях, да Новага года ў Белдзяржуніверсітэце плануецца адкрыццё Цэнтра міжнароднай інфармацыі, у якім будзе сканцэнтравaная інфармацыя па разнастайных міжнародных праграмах, конкурсах, вну і г.д. Цяпер у студэнтаў і выкладчыкаў з'явіцца значна болей магчымасцей рэалізаваць сябе як у нас, так і за мяжой. Цэнтр міжнароднай інфармацыі дапаможа вам справіцца з афармленнем заявак і матэрыялаў.

## І мы не лыкам шытыя

Дэлегацыя Белдзяржуніверсітэта прыняла ўдзел у святкаванні Дня Навукі, які праходзіў у Пікардыйскім універсітэце імя Ж.Верна ў Францыі 6-8 кастрычніка.

***

Студэнты і супрацоўнікі БДУ удзельнічалі ў Свяце кітайскай нацыянальнай кухні, прысвечаным утварэнню КНР, якое адбылося 26 верасня ў Беларускім таварыстве Дружбы.

## На вучобу ў Галандыю...

У хуткім часе вучоба ў Галандыі стане рэальнасцю, бо днямі падпісаны пратакол аб накіраванні студэнтаў-прыродазнаўчых факультэтаў БДУ ў Тэхналагічны універсітэт горада Энтховена (Галандыя). Прафесар Энтховенскага універсітэта Лаперэ, кіраўнік гэтага праекта з галандскага боку, сур'ёзна зацікавіўся Беларуссю... Так што перад намі адкрыліся новыя далягляды...

## ...і ў Амерыку

Увага! Вы хочаце паехаць вучыцца ў ЗША? У вас ёсць такая магчымасць. Для гэтага трэба толькі быць студэнтам II - IV курса БДУ, валодаць англійскай мовай і падаць дакументы ў Кансорцыум Амерыканскіх Коледжаў. Больш поўную інфармацыю можна атрымаць ва Упраўленні па міжнародных сувязях БДУ у Прылоўскага А. М.

## Прыняты дакумент

Супрацоўнікамі Упраўлення па міжнародных сувязях Белдзяржуніверсітэта выпушчаны першы зборнік дакументаў і матэрыялаў па міжнароднай дзейнасці ў БДУ. З некаторымі матэрыяламі вы можаце пазнаёміцца ў гэтым выпуску нашай газеты.

## На КВЗ

14 кастрычніка адбудзецца паўфінальная гульня КВЗ. Па тэлебачанню яна будзе транслiравацца прыкладна 22 кастрычніка. Мы жадаем камандзе БДУ перамогі. Усім, хто жадае бліжэй пазнаёміцца з усімі членамі каманды, мы прапануем сачыць за інфармацыяй у наступных нумарах газеты.

<u>*Весткі з бібліятэкі*</u>

Сёння бібліятэка БДУ знаходзіцца ў цяжкім стане: на набыццё неабходнай літаратуры грошы выдзяляюцца не вельмі часта, а то і не выдзяляюцца зусім. Аднак і ў гэтых умовах праз дабрачынную дапамогу і некаторыя формы абмену з бібліятэкамі краін СНД і дальняга замежжа бібліятэка атрымлівае пэўную колькасць патрэбных кніг.

Так, напрыклад, 70 кніг былі атрыманы ад пасольства Рэспублікі Польшча. Па праграме "Аднаўленне гуманітарнай адукацыі" была атрымана бібліятэчка кніг з каштоўнымі навуковымі дапаможнікамі, якія выдаваліся ў Расіі і вытрымалі там вялікі конкурс.

І яшчэ адна прыемная навіна — у рамках праграмы "Тэмпус" бібліятэка БДУ атрымала абсталяванне і кампакт-дыскі, якія ўтрымліваюць рэфератыўную інфармацыю па розных галінах навукі. Каштоўнасць новага абсталявання ў тым, што ў хуткім часе кожная кафедра будзе мець магчымасць не адлучаючыся з працоўнага месца даведацца аб наяўнасці патрэбнай літаратуры ў бібліятэцы альбо пацікавіцца новымі паступленнямі кніг.

Што датычыць забеспячэння студэнтаў камплектамі навучальнай літаратуры, дык сёлета ўсё адбылося звычайна. Толькі праявілася актыўнасць студэнтаў старэйшых курсаў у атрыманні падручнікаў (раней старшакурснікі ставіліся да гэтага абыякава).

І яшчэ адной навіной бібліятэка парадуе: значна змяніўся інтэр'ер чытальнай залы для выкладчыкаў. Тут створаны ўтульныя рабочыя месцы.

## На чэшскай мове.

Бібліятэка БДУ да пачатку навучальнага года атрымала каля ста назваў кніг на чэшскай мове — слоўнікі і іншая вучэбная і мастацкая літаратура.

## Далучаемся да сусветнага...

Сёння сусветная бібліяграфічная інфармацыя па прыродазнаўчых навуках за апошнія 10 год стала даступнай кожнаму навукоўцу і студэнту БДУ. Па міжнароднай праграме "ТЭМПУС" бібліятэка Белдзяржуніверсітэта атрымала CD-ROM і бібліяграфічны банк данных па прыродазнаўчых навуках "Паскаль". Гэта значыць, што цяпер вы зможаце лёгка знайсці звесткі аб літаратуры па тым ці іншым пытанні, а таксама атрымаць сціслую інфармацыю аб кожнай кнізе.

Бібліятэка запрашае ўсіх навукоўцаў і аматараў прыродазнаўства да супрацоўніцтва.

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

<u>**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**</u>

**ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ:** эканамічнай тэорыі ( 0,5 стаўкі), прыкладной лінгвістыкі, крыніцазнаўства і музеязнаўства;

**ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:** тэарэтычнай фізікі, лазернай фізікі і спектраскапіі, фізічнай оптыкі, фізікі цвёрдага цела, фізікі паўправаднікоў, ядзернай фізікі, атамнай фізікі і фізічнай інфарматыкі, біяфізікі, квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі, тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі, тэарэтычнай механікі і робататэхнікі, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, вышэйшай алгебры, тэорыі функцый, лікавых метадаў і праграміравання, ураўненняў матэматычнай фізікі, неарганічнай хіміі, аналітычнай хіміі ( 0,25 стаўкі), фізічнай геаграфіі і аховы прыроды, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, крыніцазнаўства і музеязнаўства ( 0,5 стаўкі), эканамічных навук, псіхалогіі;

**СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** вышэйшай алгебры, тэорыі функцый, фізікі, агульнай матэматыкі, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, прыкладной лінгвістыкі, раманскіх моў, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, медыцынскай падрыхтоўкі, фізічнага выхавання і спорту;

**ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ** англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў;

**АСІСТЭНТА КАФЕДРЫ** глебазнаўства і геалогіі.

*Тэрмін конкурса — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

Адрас: 220050, г.Мінск, праспект Ф.Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 26-59-39.

Аб'ява надрукавана ў газеце "Беларускі універсітэт" ***12 кастрычніка*** *1995 года.*

<u>*Конкурсы*</u>

3 кастрычніка адбыўся конкурсны адбор студэнтаў БДУ у спецыяльную групу для вывучэння нямецкай мовы. Іх чакае навучанне ў Германіі ў Рурскім і Йенскім універсітэтах.

<u>*Коратка*</u>

Як паведамілі карэспандэнту "Беларускага універсітэта" у студэнцкім сектары аддзела кадраў, зараз у БДУ на дзённым аддзяленні займаецца 9097 студэнтаў. З іх 767 — платнікаў.

<u>*Анонс*</u>

Спадары! Нагадваем, што 13-14 красавіка 1995 года ў Мінску адбудзецца першы адкрыты турнір па брыджу "Кубак Універсітэта". Ладзіць яго Беларускі Саюз Брыджа сумесна з Мінскім інтэлект-клубам "Рэгул".

Рэпартаж з турніра чытайце ў нашых бліжэйшых нумарах.

***Інфармацыйную старонку рыхтавалі: Вольга Хадарэнка, Валерыя Аўсянік, Паліна Грушына.***

*Нашы госці*

# "Я называю сябе свабодным на адну трэць"

***Трэцяга кастрычніка гэтага года Германія адзначыла пяцігадовы юбілей свайго аб'яднання. Гэту гістарычную падзею пяцігадовай даўніны, таксама як і саракагадовай ( калі адбылося раз'яднанне), нельга ацаніць адназначна. Аб'ядналіся краіны з розным укладам палітыкі і эканомікі. Як адбываецца далейшае развіццё былой ГДР у складзе аб'яднанай краіны — тэма лекцыі, якую прачытаў студэнтам юрыдычнага факультэта БДУ былы выкладчык адной з сельскагаспадарчых вну Усходняй Германіі доктар Бернхард Фіш.***

***Доктар Фіш працаваў выкладчыкам рускай мовы для немцаў і нямецкай мовы для замежнікаў больш за 40 гадоў. Чатыры гады таму выйшаў на пенсію і цяпер вольны час прысвячае любімым заняткам — вывучэнню гісторыі Германіі і падарожжам.***

Міні-інтэрв'ю, якое "Беларускі універсітэт" прапаноўвае сваім чытачам адбылося адразу пасля лекцыі.

**— Што датычыцца змен, то нам, таксама развітаўшымся з марксісцка-ленінскімі тэорыямі і стаўшым на шлях рынкавых адносін, гэта знаёма. Што ж засталося ў напамінанне аб часах Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі?**

— Ва Усходняй Германіі адбыліся значныя перамены і вылучыць што засталося не вельмі лёгка. Я налічыў толькі тры рэчы, якія былі прыняты Заходняй Германіяй. Па-першае, гэта стрэлка светлафора, якая дазваляе паварот. Здаецца, гэтае вынаходніцтва прыйшлося даспадобы месным уладам і ў Боне павесілі ... адну такую стрэлку. Яна і па сёння засмучае сваёй прысутнасцю бонскіх вадзіцеляў. Па-другое, на мяжы западнікаў замест "іх" гордага орла павесілі "нашу" мудрую саву. Па-трэцяе, захаваўся Закон аб горнай справе, які аблягчае заходнім прадпрымальнікам засваенне рэсурсаў Усходняй Германіі.

Тым не менш адносіны з боку ФРГ да сваіх гістарычных суайчыннікаў не надта паважлівыя. Напрыклад, заходнія спецыялісты, якія працуюць у нас, атрымліваць надбаўку да заробка за bush, што ў перакладзе з англійскай гучыць прыкладна як "гушчар, цёмны лес".

**— Напэўна, у складзе ФРГ з'явілася больш свабоды і магчымасцяў для рэалізацыі вашых планаў.**

— Не зусім. За пяць гадоў у заходніх часопісах размясцілі толькі адзін мой артыкул. Нават пенсію я атрымліваю ў тры разы менш, чым мае заходнія калегі, нібы я працаваў менш за іх. Таму я называю сябе свабодным на адну трэць.

**— Што адбываецца зараз у сістэме адукацыі Усходняй Германіі?**

— Усходняя Германія перайшла да сістэмы ўзору Заходняй з усімі вынікаючымі наступствамі: аплатай за вучобу, адсутнасцю размеркавання. Вялікія грошы сённяшнім навучэнцам даводзіцца траціць на падручнікі: у сярэднім адна кніга каштуе каля 30-40 марак. Таму імкнуцца знайсці выйсце, напрыклад, перадаваць адзін аднаму. Галоўная ж праблема для выпускнікоў — гэта знайсці работу. Колькасць беспрацоўнай моладзі павялічваецца, і выпускнікі ужо не глядзяць у будучыню з такой упэўненасцю, як гэта было раней.

***Алёна Шаўкун***

*Выставы*

## Германія вачыма Юрыя Іванова...

Цудоўнае спатканне з Германіяй падарыў нам усім Юрый Іваноў, фотакарэспандэнт РИА "Новости" ў Беларусі.

Хіба Вы не марылі пабываць у Германіі? Ну, хацяб адным вокам паглядзець — якія яны, немцы? Як іхнія славутыя акуратнасць і педантычнасць? Словам, як жывеш, Германія?

Трапіўшы на выставу, пачынаеш разумець, што многія з фатаграфій, прадстаўленых тут, напэўна, мелі якую-небудзь цікавую перадгісторыю ці сустрэчу. Напрыклад, вось з тым сімпатычным псом ці вясёлым панкам, які так лоўка наставіў свой "іракез". А вось і сустрэча з вулічнымі музыкамі, людзьмі, якія ствараюць настрой прахожым. Вось заапарк: фатографу пазіруюць драпежнікі (здаецца, пантэра ці леапард). Серпантынам цягнецца серабрыстая дарога праз горы, а па ёй імчыцца самотны старэнькі аўтамабіль.

Пейзаж невялікага нямецкага гарадка: у цэнтры — кірха, навокал тоўпяцца двухпавярховыя дамкі, жоўтая лістота дрэваў — фонам.

А яшчэ мне пасміхаецца чалавек. Вясёлы такі, увесь абсалютна руды — з рудой барадой і вяснянкамі. І сапраўды хочацца пасміхнуцца яму ў адказ.

Такая вось яна, Германія вачыма Юрыя Іванова...

***П.Грушына***

## У Мінск прыехалі дыназаўры

З 7 кастрычніка 1995 года ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры, што размешчаны па вуліцы Карла Маркса, 12, ўпершыню ў нашым горадзе, другім пасля Масквы на прасторах СНД, адчыніла свае дзверы грандыёзная шоу-выстава дагістарычных жывёл, што жылі ў мезазойскую эру, — дыназаўраў. Гэтая выстава мела вялікі поспех у многіх краінах свету, больш 80 мільёнаў чалавек атрымалі задавальненне ад прагляду механізаваных далёкіх гаспадароў нашай планеты. Дыназаўры з'явіліся на закаце палеазойскай эры, прыкладна 240 мільёнаў гадоў таму назад. Іх акамянелыя рэшткі знойдзены ў Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы, Афрыцы, Аўстраліі, Еўропе і Азіі. Даследаванні палеантолагаў даюць падставы падзяляць дыназаўраў на птушкападобных і яшчарападобных. Яны былі драпежнікамі, бегалі на магутных задніх канечнасцях, а пярэднія выкарыстоўвалі для нападаў. У працэсе эвалюцыі ад яшчарападобных пайшлі траваядныя.

Дыназаўры былі гаспадарамі планеты на працягу 135 мільёнаў гадоў. Іх панаванне скончылася нечакана ў канцы мезазоя па ўсім свеце амаль адначасова. Вельмі шмат было вынесена гіпотэз — некаторыя звязваюць знікненне дыназаўраў са змяненнем клімату, іншыя лічаць, што прычынай было касмічнае выпраменьванне...

Макеты, выраблены па найноўшай японскай тэхналогіі, уразілі сваімі памерамі, рухамі, моцным рыкам. Арганізатары выставы апрабавалі "сваіх пачвар" на сталічных журналістах, ведаючы, што іх заўсёды цяжка чым-небудзь уразіць.

Спяшайцеся на выставу, тэрмін дэманстрацыі экспазіцыі будзе залежаць ад нашай зацікаўленасці. Гуртуйцеся разам — для калектыўных заявак прадугледжаны значныя скідкі. На выставе вы зможаце набыць сувеніры, цацкі, літаратуру.

***Павел Карназыцкі***

*Афіцыйна*

## Палажэнне аб арганізацыі міжнароднага

Міжнародная дзейнасць Беларускага дзяржаўнага універсітэта будуецца ў адпаведнасці з дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і Статутам Белдзяржуніверсітэта і накіроўваецца наператварэнне БДУ у вядучы нацыянальны і міжнародны цэнтр адукацыі, навукі і культуры, інтэграванне яго ў еўрапейскую і сусветную адукацыйную сістэму, сусветнае прызнанне атрыманай у Белдзяржуніверсітэце кваліфікацыі і выданых ім дыпломаў.

Для дасягнення гэтых мэтаў выкарыстоўваюцца наступныя формы і накірункі дзейнасці:

— развіццё эфектыўных узаемавыгадных партнёрскіх сувязяў з вядучымі універсітэцкімі цэнтрамі свету, навуковымі, прамысловымі, культурнымі ўстановамі іншых краін, падрыхтоўка двухбаковых і шматбаковых рабочых праграм супрацоўніцтва ў галіне навукі, адукацыі і культуры,

— удзел у міжнародных праектах і праграмах,

— правядзенне на базе Белдзяржуніверсітэта міжнародных навукова-практычных канферэнцый, сімпозіумаў, семінараў,

— накіраванне для праходжання навучання, стажыроўкі і абмену вопытам за мяжой выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў Белдзяржуніверсітэта,

— запрашэнне ў Белдзяржуніверсітэт высокакваліфікаваных замежных спецыялістаў для чытання лекцый, правядзення кансультацый, аказання метадычнай дапамогі ва ўдасканаленні структуры і сістэмы адукацыі,

— укараненне сучасных метадаў і сродкаў камунікацыі, атрымання, аналізу, распаўсюджання і абмену інфармацыі,

— стварэнне магчымасцей і паляпшэнне ўмоў для вывучэння супрацоўнікамі і студэнтамі універсітэта замежных моў,

— падрыхтоўка спецыялістаў для замежных краін на кантрактнай аснове.

Планаванне, каардынацыю і аналіз міжнароднай дзейнасці Белдзяржуніверсітэта ажыццяўляе Савет па міжнароднаму супрацоўніцтву, які ўзначальвае рэктар.

Арганізацыйнае, тэхнічнае і інфармацыйна-метадычнае забеспячэнне міжнароднай дзейнасці ўскладаецца на ўпраўленне па міжнародных сувязях Белдзяржуніверсітэта.

***1 раздзел. Прынцыпы і рэгламент дзейнасці Савета па міжнароднаму супрацоўніцтву Белдзяржуніверсітэта.***

Савет па міжнароднаму супрацоўніцтву Белдзяржуніверсітэта, створаны рашэннем Вучонага Савета Белдзяржуніверсітэта 31 студзеня 1994 года, з'яўляецца калектыўным кансультацыйным органам, закліканым здзяйсняць планаванне, каардынацыю і аналіз міжнароднай дзейнасці.

У Савет дэлегіруюцца тэрмінам на адзін навучальны год прадстаўнікі факультэтаў і асноўных падраздзяленняў універстэта. Персанальны склад Савета зацвярджаецца загадам рэктара.

Кіруе дзейнасцю Савета рэктар Белдзяржуніверсітэта. Яго намеснікам з'яўляецца начальнік упраўлення па міжнародных сувязях. Вырашэнне разнастайных тэхнічных пытанняў ажыццяўляе сакратар Савета.

Паседжанні Савета праводзяцца па меры неабходнасці. Рашэнні прымаюцца простай большасцю прысутных членаў Савета пры ўмове ўдзелу ў паседжанні не менш пяцідзесяці працэнтаў ад агульнай колькасці членаў Савета. Рашэнні Савета носяць рэкамендацыйны характар.

У функцыі Савета ўваходзяць:

— падрыхтоўка і аналіз дакументаў (палажэнняў, загадаў і г.д.), якія рэгламентуюць міжнародную дзейнасць і навучанне замежных навучэнцаў у Белдзяржуніверсітэце,

— падрыхтоўка рэкамендацый па вызначэнню прыярытэтных накірункаў міжнароднай палітыкі універсітэта,

— удзел у распрацоўцы міжнародных праектаў, рабочых праграм з універсітэцкімі вну-партнёрамі, аналіз іх выканання,

— даследаванне эфектыўнасці замежных камандзіровак супрацоўнікаў і студэнтаў Белдзяржуніверсітэта на падставе аналізу планаў камандзіровак, справаздач і субяседванняў з камандзіраванымі,

— падрыхтоўка рэкамендацый рэктарату аб фінансаванні замежных камандзіровак,

— абагульненне і распаўсюджванне вопыту міжнароднай дзейнасці,

— аказанне дапамогі ў атрыманні, перадачы і абмене інфармацыі, датычнай міжнароднай дзейнасці паміж падраздзяленнямі універсітэта,

— адбор студэнтаў для навучання за мяжой у адпаведнасці з універсітэцкімі міжнароднымі праграмамі.

Для вырашэння перспектыўных і бягучых пытанняў у сферы міжнароднай дзейнасці БДУ у складзе Савета могуць стварацца групы ці камісіі.

***2 раздзел. Парадак заключэння міжнародных дагавораў***

Для пашырэння супрацоўніцтва Беларускі дзяржаўны універсітэт заключае Дагаворы (Пагадненні) з замежнымі навучальнымі ўстановамі і іншымі партнёрскімі арганізацыямі.

Дагавор падпісваецца рэктарам ці асобай, якая выконвае абавязкі рэктара ў выпадку яго адсутнасці, пасля абмеркавання на пасяджэнні рэктарата.

У Дагаворы агаворваюцца мэты і формы супрацоўніцтва, адказнасць бакоў, тэрмін дзеяння, фінансавае забеспячэнне супрацоўніцтва. Як правіла, дадаткам да Дагавору з'яўляецца рабочая праграма, якая складаецца на адзін-два гады, падпісаная рэктарам ці асобай, якая выконвае абавязкі рэктара. У рабочай праграме канкрэтызуюцца тэмы сумесных даследаванняў, канферэнцый і семінараў, графікі замежных камандзіровак кіраўнікоў і супрацоўнікаў, студэнцкія абмены, выпуск сумесных публікацый, фінансавае забеспячэнне. Мерапрыемствы, прадугледжаныя ў рабочай праграме, могуць фінансавацца са сродкаў, выдзеленых на распрацоўку навуковай тэматыкі, бюджэтных сродкаў Белдзяржуніверсітэта, іншых крыніц (сродкаў спонсараў, фондаў і г.д.).

Факультэт (кафедра) маюць права абмяркоўваць магчымасць заключэння Праграмы супрацоўніцтва з аналагічнымі падраздзяленнямі навучальных і навуковых арганізацый. У Праграме супрацоўніцтва адлюстроўваецца тэматыка сумесных даследаванняў, абмены супрацоўнікамі, студэнтамі, крыніцы і ўмовы фінансавання і г.д. Праект Праграмы супрацоўніцтва ў абавязковым парадку ўзгадняецца з рэктарам БДУ, прарэктарам па навуцы, упраўленнем па міжнародных сувязях, бухгалтэрыяй. Праграма супрацоўніцтва зацвярджаецца рэктарам Белдзяржуніверсітэта. Падпісаныя экземпляры Праграмы прадстаўляюцца прарэктару па на-

*Прэс - апытанне*

# Кніга — крыніца ведаў?



Кажуць, што студэнты — публіка, якая чытае больш за іншых. Рэдакцыя газеты "Беларускі універсітэт" вырашыла праверыць: ШТО чытаюць студэнты? Паколькі бібліятэка — не паказчык ( там бяруць тое, што трэба па праграме), то мы вырашылі звярнуцца ў кніжныя кіёскі на факультэтах з пытаннем "Якая літаратура карыстаецца попытам?" Адказы Вы можаце прачытаць ніжэй.

**Юзефовіч Е.П.** ( галоўны корпус, "Белсаюздрук"):

— Усё патроху ідзе: і літаратура, і газеты.

**Бахур Г.І.** ( кніжны кіёск, галоўны корпус):

— Попытам карыстаюцца падручнікі. Праўда, раней яны паступалі па тэмплану, а зараз такога няма. Іх мала зараз засталося... Вось заходзяць матэматыкі, юрысты, гісторыкі...

**Зонаў С.У.**, прадавец ( галоўны корпус):

— Бяруць літаратуру па камп'ютэрнай пісьменнасці, па філасофіі... Паэзію добра бяруць, літаратуру для падрыхтоўчых аддзяленняў...

**Грудзінскі П.М.**, прадавец ( гістфак):

— Бяруць, збольшага, літаратуру расійскіх выдавецтваў апошніх гадоў па гісторыі, філасофіі гісторыі. Старыя выданні купляюць неахвотна.

**Масалова І.У.**, прадавец ( філфак):

— Мастацкую літаратуру купляюць, па філасофіі. Вялікім попытам карыстаюцца кнігі па псіхалогіі. Але каб гэта нашыя выдавецтвы выпускалі. А то маскоўскія выданні дужа дарагія.

У **кніжным кіёску "Філолаг"** (філфак) карэспандэнту "БУ" паведамілі:

— Мы гандлюем вучэбна-метадычнай і спецыяльнай літаратурай. Бяруць і спецыяльную, і мастацкую, бо мы падбіраем літаратуру так, каб яна спатрэбілася для заняткаў.

У **"Кніжнай лаўцы"** ( хімфак) адказ быў такі:

— У нас ёсць вучэбная літаратура, філасофская, эзатэрычная. Зараз, як пачаўся навучальны год, болей бяруць вучэбную. А так — заходзяць, глядзяць, купляюць што спадабаецца.

***М.Тапіля***

***"Нельзя держать книги запёртыми точно в тюрьме, они должны непременно переходить из библиотеки в память"***
***Петрарка***

# Добрая бібліятэка — вялікі скарб асветы і культуры

Бібліятэка універсітэта зноў прадоўжыць размову аб кнігах, якія яна сабрала і захоўвае ў сваіх кнігасховішчах, і крыху раскажа пра яе дзейнасць і жыццё.

Жыццёвы шлях фундаментальнай бібліятэкі універсітэта ў параўнанні з бібліятэкамі другіх дзяржаў зусім невялікі, але сёння яна мае права на сваю гісторыю і свой лёс, які не вельмі падобны на лёс іншых бібліятэк.

Бібліятэка Белдзяржуніверсітэта дзейнічае з 1921 года. Першапачатковы фонд яе склаў 40 тысяч экземпляраў кніг. Абслугоўвала яна ў той час звыш 1000 чытачоў ( выкладчыкаў і студэнтаў). Але ўжо з самага пачатку свайго існавання ( з 1922 года) універсітэцкая бібліятэка аб'ядналася з Беларускай дзяржаўнай бібліятэкай. З гэтага часу акрамя сваіх асноўных абавязкаў ( забеспячэнне кнігай навучальнага і навуковага працэсаў, фарміравання фонду вузаўскай бібліятэкі) яна пачала займацца зборам і захоўваннем нацыянальнай літаратуры рэспублікі і адначасова стала яе бібліяграфічным цэнтрам — вядзе ўлік усёй друкаванай прадукцыі, якая выходзіць на тэрыторыі Беларусі. У 1926 годзе Беларуская дзяржаўная бібліятэка вылучаецца з універсітэцкай і пачынае працаваць самастойна.

Да 1941 года бібліятэкай універсітэта было сабрана каля 200 тысяч экз. выданняў. Але Вялікая Айчынная вайна цалкам спыніла яе жыццёвы шлях.З 200-тысячнага фонду засталося толькі каля 3 тысяч разрозненых выданняў. Лепшыя выданні нямецка-фашысцкія захопнікі вывезлі ў Германію, тыя, што палічылі непатрэбнымі, спалілі. Другое нараджэнне універсітэцкай бібліятэкі пачалося на станцыі Сходня ( пад Масквой), дзе ў 1943 годзе пачаў працаваць Белдзяржуніверсітэт.

Фарміраванню фонду бібліятэкі ў тыя цяжкія гады дапамаглі Маскоўскі дзяржаўны універсітэт імя М.В.Ламаносава, Маскоўскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя К.Лібнехта, Дзяржлітфонды Масквы і іншыя установы горада. Пасля Вялікай Айчыннай вайны вялікую дапамогу бібліятэцы аказалі Навуковая бібліятэка Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта ( з дублетных і рэзервных фондаў выдзелена каля 3000 тамоў), Дзяржаўная Публічная бібліятэка імя Салтыкова-Шчадрына і многія іншыя бібліятэкі з розных гарадоў Савецкага Саюза. Нацыянальная дзяржаўная бібліятэка РБ са сваіх дублетных фондаў у 1945 годзе выдзеліла каля 3000 розных часопісаў. Гэтыя выданні сёння лічацца "залатым фондам" бібліятэкі Дзяржуніверсітэта і захоўваюцца ў аддзеле рэдкіх і каштоўных кніг.

У пасляваенныя гады мір, які прыйшоў на беларускую зямлю даваў бібліятэцы свае сілы для плённай працы. Даваеннага ўзроўню па колькаснаму складу фондаў бібліятэка дасягнула толькі ў 1954 годзе.

У 1962 годзе бібліятэка атрымала новае памяшканне ў галоўным корпусе БДУ — з прасторнымі кнігасховішчамі і добрымі чытальнымі заламі (зараз кнігасховішча перапоўнена).

Найбольш спрыяльнымі ўмовамі для фарміравання фонду і развіцця дзейнасці бібліятэкі былі 60-90-я гады. Менавіта за тры дзесяцігоддзі яна змагла сабраць у сваіх кнігасховішчах звыш 2 млн. экземпляраў. Колькасць чытачоў, якія наведваюць бібліятэку, складае 22 тысячы ( штодзённа — каля 3 тысяч) чытачоў. А выдае бібліятэка ім каля 7 тысяч выданняў штодзённа.

Сёння бібліятэка Белдзяржуніверсітэта — вялікая скарбніца асветы і культуры.

***Міцкевіч Л. П., заг. аддзела рэдкіх і каштоўных кніг***

## супрацоўніцтва ў Белдзяржуніверсітэце

вуцы і ва ўпраўленне па міжнародных сувязях.

Арыгіналы Дагавораў, рабочых праграм, Праграм супрацоўніцтва захоўваюцца ва ўпраўленні па міжнародных сувязях Белдзяржуніверсітэта.

Выключнае права заключэння кантрактаў на выкананне навуковых, навукова-вытворчых і іншых работ з замежнымі партнёрамі належыць рэктару. Механізм, прававыя асновы заключэння такога кшталту кантрактаў, парадак стымулявання выканаўцаў агаворваюцца ў спецыяльным палажэнні.

Дзейнасць факультэтаў, кафедраў, падраздзяленняў, асобных супрацоўнікаў Белдзяржуніверсітэта па арганізацыі сумесных навукова-даследчых работ, канферэнцый, сімпозіумаў, кангрэсаў, абменаў неапублікаванымі вынікамі даследаванняў з замежнымі партнёрамі, арганізацыя міжнародных абменаў супрацоўнікамі і студэнтамі, а таксама любая іншая міжнародная дзейнасць ад імя універсітэта ці з выкарыстаннем зноў атрыманых вынікаў даследаванняў у БДУ, ці з выкарыстаннем плошчаў, абсталявання Белдзяржуніверсітэта без папярэдняга ўзгаднення з кіраўніцтвам універсітэта і па-за рамкамі агавораных вышэй Дагавораў і Праграм супрацоўніцтва не дапускаецца.

***3 раздзел. Парадак камандзіравання супрацоўнікаў, аспірантаў універсітэта за мяжу***

Штатны супрацоўнік універсітэта, які атрымаў запрашэнне для паездкі за мяжу для навукова-педагагічнай працы або іншай дзейнасці, звязанай з яго работай у Белдзяржуніверсітэце, падрыхтоўвае наступныя дакументы і прадстаўляе іх на разгляд рэктару (першаму прарэктару):

— службовую запіску факультэта (агульнауніверсітэцкай кафедры), якая ўключае ў сябе план-абгрунтаванне з падрабязным выкладам неабходнасці паездкі, актуальнасці гэтай навуковай тэмы, плана будучых даследаванняў, магчымых вынікаў і г.д., указаннем фінансавых расходаў з боку Белдзяржуніверсітэта, указаннем магчымасці замены камандзіраванага на перыяд яго адсутнасці. Да прадстаўлення рэктару службовая запіска завяраецца ў 1-м аддзеле Белдзяржуніверсітэта. Аб'ём службовай запіскі не павінен перавышаць дзвюх старонак машынапіснага тэксту. Службовая запіска падпісваецца дэканам факультэта (загадчыкам агульнауніверсітэцкай кафедры) і камандзіруемым,

— арыгінал запрашэння, які адпавядае патрабаванням консульскіх устаноў краіны прыезду. У запрашэнні павінны агаворвацца мэта візіту, тэрмін візіту, умовы медыцынскага страхавання, аплата расходаў па праезду, пражыванню, харчаванню, заробку (стыпендыі),

— пераклад запрашэння на беларускую (рускую) мову.

Рэктар (першы прарэктар) разглядае пытанне аб мэтазгоднасці камандзіравання, аб аплаце транспартных выдаткаў і камандзіровачных, аб чым робіць адпаведны запіс на службовай запісцы. Рашэнне аб аплаце транспартных выдаткаў і выплаце камандзіровачных залежыць ад прыярытэтнасці гэтага накірунку міжнароднага супрацоўніцтва і фінансавых магчымасцей універсітэта.Парадак выдзялення фінансавых сродкаў на камандзіраванне супрацоўнікаў БДУ за мяжу, іх аб'ём і размеркаванне паміж падраздзяленнямі рэгламентуецца загадам рэктара.

Пасля атрымання станоўчага рашэння камандзіруемы прадастаўляе ва ўпраўленне па міжнародных сувязях універсітэта наступныя дакументы:

а) пры бязвізавым выездзе :

— службовую запіску з візай рэктара ,

— копію запрашэння,

— пераклад запрашэння,

— аўтабіяграфічную даведку.

Далейшае афармленне дакументаў адбываецца ў парадку, устаноўленым адпаведнымі нормамі Рэспублікі Беларусь.

б) пры візавым выездзе :

— службовую запіску з візай рэктара ,

— арыгінал і ксеракопію запрашэння,

— пераклад запрашэння ў 2-х экземплярах,

— аўтабіяграфічную даведку,

— пасольскія анкеты,

— фатаграфіі,

— замежны пашпарт,

— консульскі збор.

Дакументы падаюцца ва ўпраўленне па міжнародных сувязях універсітэта за тэрмін не меншы, чым устаноўлены час афармлення візы ў адпаведным замежным пасольстве + 10 дзён.

Афармленне замежнага пашпарта з захаваннем неабходных фармальнасцей адбываецца ў індывідуальным парадку , аплата ўсіх выдаткаў, звязаных з гэтай працэдурай, адбываецца з асабістых сродкаў камандзіруемага за мяжу.

Упраўленне па міжнародных сувязях Белдзяржуніверсітэта рыхтуе ў неабходных выпадках заяўку на заказ праязных дакументаў. Браніраванне і афармленне білетаў камандзіруемы робіць самастойна.

Упраўленне па міжнародных сувязях універсітэта рыхтуе загад аб камандзіраванні гэтага супрацоўніка. Загад з'яўляецца абгрунтаваннем для аплаты камандзіровачных выдаткаў, у тым ліку і ў валюце, і рыхтуецца не пазней сямі дзён да выезду.

Пры камандзіраванні за мяжу на тэрмін больш за 31 каляндарны дзень заробак супрацоўніку Белдзяржуніверсітэта не захоўваецца.

Пры вяртанні з-за мяжы камандзіруемы абавязаны ў двухтыднёвы тэрмін прадставіць падрабязную справаздачу аб зробленай рабоце ва ўпраўленне па міжнародных сувязях. Справаздача папярэдне зацвярджаецца кіраўніцтвам факультэта (кафедры). Справаздача можа быць разгледжаная на пасяджэнні Савета па міжнароднаму супрацоўніцтву універсітэта.

Пры камандзіраванні на тэрмін больш за 31 дзень супрацоўнік абавязаны прадставіць ва ўпраўленне па міжнародных сувязях універсітэта ў тэрмін не раней за 3 і не пазней за 6 месяцаў пасля заканчэння тэрміна камандзіравання даведку аб абследаванні на наяўнасць віруса СНІД.

Супрацоўнікі, якія не прадаставілі своечасова справаздачу і, у неабходных выпадках, даведку аб абследаванні на наяўнасць віруса СНІД, пазбаўляюцца права наступнага камандзіравання да ліквідацыі запазычанасці.

У выпадку поўнай ці частковай аплаты Белдзяржуніверсітэтам камандзіровачных (у тым ліку транспартных) выдаткаў камандзіруемы абавязаны ў тыднёвы тэрмін пасля вяртання з-за мяжы прадставіць у бухгалтэрыю справаздачу, ва ўстаноўленай для гэтых падраздзяленняў БДУ форме.

У выпадку неабходнасці падаўжэння замежнай камандзіроўкі супрацоўнік накіроўвае рэктару Белдзяржуніверсітэта заяву з просьбай аб падаўжэнні тэрміна камандзіроўкі.

***(Працяг у наступным нумары)***

# ТУСОЎКА

## МАЛАЯ СТУДЭНЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

Абібок — студэнт, які ўвесь час збіраецца штосьці рабіць.

Абсурд — калі студэнт, атрымаўшы двойку, пабяжыць дзякаваць дацэнту за аб'ектыўнасць.




Адказ (правільны) — прыемная нечаканасць, на якую выкладчык менш за ўсё спадзяецца.

Адпачынак — час, калі студэнт спіць колькі хоча, есць — калі хоча.

Акадэмічны адпачынак — часта самы доўгі пасля непаспяховай сесіі.

Ападкі — студэнты, пакінутыя паўтараць той самы курс.

Аптыміст — чалавек, які чакае не дачакаецца свайго вяселля.

Аспірант — чалавек, які глыбока крыўдзіцца пасля пытання аб тым, калі ён збіраецца абараняць дысертацыю.

Атэіст — студэнт, які вымае шпаргалку са словамі на вуснах: "Цудаў у нашыя часы ў свеце не бывае".

Аўтобус — невялікая перасоўная студыя для практычных заняткаў па самаабароне.

Ау-у-у — сігналы нявопытнага студэнта.

Ахвяра — студэнт, які не здолеў у час іспыту падмануць выкладчыка.

Барада — знак незвычайна субтыльнай унутранай духоўнай арганізацыі студэнта.

Бібліятэка — а) месца вымушана-самастойнай работы студэнта; б) месца, дзе абсалютна беспакарана можаш спісваць усё.

Буфет — найбольш часта наведваемая студэнцкая аўдыторыя.

Вада — форма матэрыі, без якой не могуць быць поўнавартаснымі адказы студэнтаў на іспытах.

Варварства — мастацкая разьба і пісанне на крэслах, сценах, прываконнях і столях аўдыторый, лабараторый, у прыбіральнях і інш.

Велікадушнасць — рыса характару, якая лепш за ўсё ўвасабляецца ў старасце групы, які хавае прагульшчыка.

Выдатнік — прамень святла ў царстве цемры.

Гаспадарчы аддзел (інстытута) — пустое месца.

Геній — студэнт, які вывучыў усю дадатковую літаратуру.

Гітара — раней: музычны інструмент, зараз: турыстычны інвентар.

Грашы —рэшткі стыпендыі пасля вяртання пазык крэдыторам.

Джаз — музычны калектыў, ігру якога лёгка імітуюць галодныя ваўкі.

"Добра" ("чатыры") — адзнака, якую выстаўляе за выдатны адказ выкладчык у кепскім настроі, а ў іншым выпадку — за здавальняючы адказ выкладчык у выдатным настроі.

Ёга — мастацтва звесці канец стыпендыі з канцом месяца.

Жалезабетон — гэта асаблівы сплаў: жалеза расплаўляецца, а потым туды сыплюць бетон, і ўсё старанна перамешваецца.

Завочнік — а) гэта аптыміст, які за ноч гатовы з чужых канспектаў вывучыць граматыку кітайскай мовы, б) заўвага — адзін завочнік лепей за двух глуханямых.

Знаёмы — чалавек, блізкі настолькі, што вы маглі б пазычыць у яго грошы, але не настолькі, каб вы яму пазычалі.

Знаўца — студэнт, які ведае ўсё, толькі не ў галіне, якую ён вывучае. Часцей за ўсё гэта першакурснік.

Зубрыла — студэнт, які можа аўтаматычна адказаць нават на незразумелае яму пытанне (гл.Знаўца).

Імгненне — адзінка вымярэння шчасця.

Камікадзэ — студэнт, які выручаў дэкана.

Канспект — унікальная музейная рэдкасць, у час сессіі ацэньваецца знаўцамі сумай паўгадавой стыпендыі.

Касмапаліт — студэнт, які не атрымаў інтэрната.

Кніганоша — студэнт, які камплектуе сваю бібліятэку за кошт фондаў агульнай (факультэта і г.д.) бібліятэкі.

Крызіс — апошні тыдзень да выплаты стыпендыі.

Курсавы чарцёж — чарцёж з тлумачальнай запіскай, у якой матэматычна тлумачыцца, чаму спраектаваны агрэгат не можа працаваць.

Лекцыя — усё аб тым, аб гэтым, а часцей — ні аб чым.

Любімы выкладчык — чалавек, якому не застаецца месца ў перапоўненай аўдыторыі.

Маньяк — студэнт, хранічна хворы на ненармальную цягу да навукі.

Мафія — тайная арганізацыя спісвання (ТАС).

Меню — найбольш стабільная і не падвержаная хістанням велічыня ў буфеце студэнцкага інтэрната.

Мёртвыя душы — студэнты на апошняй лекцыі.

Мозг — орган, якім думаем, што думаем.

Наватар — студэнт, які кнігі бярэ ў бібліятэцы, а чытае іх у кафэ.

Навука — вечны пошук адказу на пытанне: ці гэта я вучыўся, ці гэта толькі праходзіў?

Настойлівы — студэнт, якога выгналі некалькі разоў за дзверы, прарываецца праз вакно.

Няведанне — сіла, якая выкідае студэнта з універсітэта.

Няўважлівасць — вышэйшая ступень засяроджанасці.

Пагарда — пачуццё, якое адчуваеш да суседа, калі ён на іспыце не ведае адказы на пытанні тваёго білета.

Пень — студэнт, які не ўмее танцаваць.

Песіміст — а) жанаты аптыміст; б) добра інфармаваны аптыміст.

Піла — інструмент грубай апрацоўкі; у вышэйшай школе сустракаецца рэдка: часцей трапляецца сякера.

Плаванне — адзін са шматлікіх метадаў здачы іспытаў у студэнтаў. (Чаму не тоне, напрыклад, студэнт і алкагольк? Таму, што першы заўжды плавае, а другому мора па калена.)

Практыка (працягла) — шматкратная перадзача аднаго і таго ж іспыта.

Прафесар — гэта студэнт, які здаў усе (!!!) экзамены.

Прымадонна — сакратарша дэкана.

Рабінзон — студэнт, які праходзіць практыку ў Папатунцы (што паблізу Петрапаўлаўска-Камчацкага).

Работа — універсальнае паняцце. Па-студэнцку гучыць так: "Без работы — цяжка, але мы цяжкасцей не баімся!"

Расклад — гэта рэч, пры складанні якой ніхто не думае ні аб студэнце, ні аб выкладчыку, а толькі аб аўдыторыі.

Рацыяналіст — студэнт, які нават у лужу імкнецца ўпасці як мага зручней.




Рубель — грашовая адзінка: адзін рубель — дробязь, некалькі рублёў — стыпендыя, многа рублёў — заробак кааператара ці рэктара.

Рызыка — высакародная справа, калі ты не рызыкуеш.

Рэферат — спісаны якінебудзь даклад (ці артыкул) і выданы студэнтам у якасці ўласнага.

Свабода — пачуццё пасля паспяховага здадзенага экзамена.

Семестр — сумнаваты прамежак часу паміж двума канікуламі.

Семінар — а) студэнцкая гульня па наступных правілах: гульцы прызначаюць выступоўцаў, тыя не прыходзяць; калі ў каго-небудзь спытаеш што-небудзь, той нічога не ведае, гэта значыць прайграў, б) варыянт для дарослых дзіцячай гульні "Маўчанне": хто першым прагаворыцца, таму "два".

Сесія — а) "Тысяча кніг і адна ноч"; б) найцікавейшая гульня, калі адны ўсё ведаюць і маўчаць, а іншыя нічога не ведаюць і гавораць, в) гэта маленькі прамежак часу, калі студэнты знаёмяцца з выкладчыкамі, вывучаемымі дысцыплінамі і будучай спецыяльнасцю.

Сімулянт — выкладчык, які імкнецца пазбавіцца ад студэнтаў са словамі: "Няма больш моцы вас пытаць".

Стараста (студэнцкай групы) — "Слуга двух паноў".

Стрыманасць — хваляванне тых, хто нічога не ведае.

Студэнт — гэта чалавек, які двойчы на год памірае, але часцей, як Фенікс, паспяхова адраджаецца.

Стыпендыя — аплата за страх у час экзаменаў. У нашыя дні — гэта лішняя дабаўка да субсідый "прадкаў".

Суфліраваць (падказваць) — перадача думак на адлегласці.

Талент — уласцівасць, якая ў лішку ў студэнтаў, асабліва ў першакурснікаў.

Тыдзень — адрэзак часу, які ў студэнта складаецца з суботы і нядзелі і актыўнай пяцідзённай падрыхтоўкі да яго.

Тэлевізар — лішняе ўпрыгожанне студэнцкага жыцця.

Уласная думка — гэта найкарацейшая адлегласць паміж дзвюма цытатамі.

Утопія — нездзяйсняльная мара студэнта, напрыклад, стаць рэктарам.

Факультатыў — заняткі, якія па свабоднаму графіку "свабодна" не наведвае ніхто,акрамя энтузіястаў.

Філасофія — навука аб бацькоўскіх снах.

Шчасце — калі раніцой хочацца ісці на лекцыі, а пасля іх — дадому.

Эгаіст — адзіны чалавек на экзамене, які ўсё ведае, але не падказвае. Як правіла, гэта — прафесар, дацэнт або выкладчык.

Экзамен — а) гэта спрэчка, у якой нараджаецца не ісціна, а адзнака; б) гэта размова двух разумных людзей. Калі адзін з іх такім не з'яўляецца, другі пазбаўляецца стыпендыі.

***З кнігі Анзельмаса Каткуса "Студэнцкі капуснік".***




***Малюнкі Опричя Кромешнего***

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
ЗАСНАВАЛЬНІК ГАЗЕТЫ — РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

12 кастрычніка
Зак. 661.
Т. 1000 экз.

Газета падпісана ў друк у 16.00.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 411—412
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В.а. рэдактара
Т.М. Казак